**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**“ ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя П.М.МАШЭРАВА “**

На правах рукапісу

УДК 37.015 (476)

Н-260

**Шухлеў Канстанцін Віктаравіч**

# “ Развіццё адукацыі на Беларусі ў перыяд з першай чвэрці XIX па першую чвэрць XX стагоддзя ” ( Полацкі край )

Спецыяльнасць: 13.00.01 Агульная педагогіка. Гісторыя педагогікі і адукацыі

Дысертацыя на саісканне акадэмічнай ступені магістра педагагічных навук

Навуковы кіраўнік :
Доктар педагагічных навук,
прафесар Арлова Г. П.

**Віцебск, 2007**

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржауны універсітэт
імя П.М Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

# Змест

Уводзіны

Глава 1. Развіццё адукацыі на Беларусі ў XIX ст.

1.1. Агульная характарыстыка адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.........2 – 9

1.2. Полацкія навучальныя ўстановы ў пачатку XIX стагоддзя. Перадумовы адкрыцця ў Полацку вышэйшых навучальных устаноў ..........................................10 – 15

1.3. Адкрыццё акадэміі ў Полацку. Арганізацыя навучальна – выхаваўчай работы ў Акадэміі.......................................................................................................15 – 23

Глава 2. Тэндэнцыі развіцця адукацыі першай чвэрці XX ст.

2.1. Стан народнай адукацыі напярэдадні і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі...........................................................................................................24 – 33

2.2. Пачаткі нацыянальнай беларускай школы у 20-х гг.............................. ....33– 41

2.3. Вышэйшая, сярэдняя і прафесіянальна - тэхнічнае навучанне ў БССР.41 – 50

Заключэнне

Спіс выкарыстаных крыніц

# Уводзіны

Для паспяховага развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі неабходна гісторыка-педагагічнае абгрунтаванне яе стратэгіі. Гістарычны вопыт, які складае каранёвую аснову сістэмы адукацыі, павінен арганічна ўваходзіць у сучасныя ўяўленні аб чалавеку як прадмеце і суб'екце адукацыйнай дзейнасці, і садзейнічаць знаходжанню сродкаў духоўнага адраджэння грамадства праз выхаванне новых пакаленняў. Новыя ідэі і канцэпцыі могуць разлічваць на трывалы поспех толькі пры ўмове, што яны абапіраюцца на ранейшыя педагагічныя набыткі. Зварот да вопыту мінулага – неабходная ўмова паяўлення сапраўды новых ідэй і канцэпцый. Навуковыя, свабодныя ад скажэнняў веды ў галіне гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі, ў тым ліку даследаванага перыяду, становяцца важным кампанентам новага педагагічнага мыслення, маральным і грамадзянскім імператывам карэнных пераўтварэнняў усёй сістэмы народнай адукацыі на падставе ідэй гуманізму і дэмакратыі, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей. Дысертацыя прысвечана выяўленню заканамернасцей развіцця айчыннай адукацыі ў перыяд з XIX па першаю чвэрць XX стст., разгляду асноўных накірункаў сацыякультурнай дынамікі адукацыі. Разгляд дынамікі дазволіць паказаць структуру і асноўныя накірункі станаўлення і развіцця адукацыі і педагагічнай думкі разглядаемага перыяду, а таксама прааналізаваць стан адукацыі і тэндэнцыі яго развіцця ў зменлівым сацыякультурным кантэксце дадзенага перыяду.

Актуальнасць дысертацыі абумоўлена як неабходнасцю філасоўскага, тэарэтыка - метадалагічнага і педагагічнага асмыслення вопыта станаўлення і развіцця адукацыі ў эпоху, калі на нашай тэрыторыі адбываліся працэсы зараджэння новых адукацыйных парадыгм, так і неабходнасцю развіваць сучасную і будучую адукацыю на аснове прынцыпа пераемнасці традыцый і наватарства, гістарычна апраўдаўшага сябе старога і новага. Акрамя таго, актуальнасць праяўляецца ў гістарычнай рэтраспектыве, бо, як вынікае з аналізу даследвання, найбольш значныя змены ў галіне адукацыі і педагагічнай думкі адбываюцца як раз у XIX – першай чвэрці XX стст. Ідзе разбурэнне агульнапрынятых грамадствам традыцый, але яно набывае зусім іншыя рысы, абумоўленыя пачаткам крызісу самадзяржаўя і нарастаннем супярэчнасцей у грамадстве. Менавіта ў гэты час узнікае праблема адукаванасці грамадства. Акрамя таго, адбываецца крызіс царскай сістэмы адукацыі ў выніку Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. І зноў, як і ў першай чвэрці XIX стагоддзя, назіраецца працэс карэнных змен у адукацыйным працэсе. Новая ўлада патрабавала стварэння новага чалавека. Народнай адукацыі адводзілася выключная роля. Перабудова школы з'ўлялася часткай так званай "культурнай рэвалюцыі", якая павінна была зрабіць пераварот у духоўным жыцці рускага і беларускага народу. Пачынаецца барацьба з непісьменнасцю, ствараецца

шчыльная сетка школ, пачынаюць працаваць сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. За тры паслярэвалюцыйныя гады быў канчаткова пакладзены падмурак новай савецкай сістэме адукацыі, вызначаны асноўныя прынцыпы і накірункі навучальнай і выхаваўчай працы, выдадзены праграмныя дакументы. Акрамя таго, ішоў працэс станаўлення беларускай нацыянальнай школы; штуршком да гэтага стала адбываючаяся ў 20 - х гадах палітыка беларусізацыі. Такім чынам, са сказанага вышэй вынікае, што менавіта гэты перыяд стаў выключнай з'явай ў развіцці адукацыйных працэсаў на беларускай зямлі. У гэты час з'явілася аснова народнай адукацыі, быў закладзены стрыжань як вышэйшай, так і агульнаадукацыйнай школьнай сістэмы. Разам з тым, у гэты перыяд часу тэрыторыя Беларусі ўступае ў новыя дзяржаўныя ўтварэнні. У першай палове XIX стагоддзя гэта была Расійская імперыя, а ў XX стагоддзі – Савецкі Саюз.

Цікавы яшчэ гэты перыяд і тым, што ў гэты час адбываецца перагляд элементаў светаўспрымання, ідзе напластаванне новых духоўных каштоўнасцей з непасрэднай зменай старых. Аналізуючы матэрыял, між волі заўважаем, што на сённяшні перыяд часу, а менавіта на першую чвэрць XXI стагоддзя, прыходзяцца карэнныя пераўтварэнні ў галіне адукацыі, зноў сучасная школа Беларусі знаходзіцца ў стане рэфармавання. Каб правесці рэформу, трэба дакладна вызначыць, якія элементы былой сістэмы адпавядаюць рэаліям сучаснага жыцця і могуць застацца ў новай школе. Любая сістэма адукацыі выконвае сацыяльны заказ і выхоўвае такога чалавека, які патрэбен дзяржаве. Савецкая школа была правадніком камуністычных ідэй і асноўнай сваёй задачай ставіла стварэнне сацыялістычнага грамадства. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў у вучняў фарміравалі пэўныя ідэалы і каштоўнасці, якія адпавядалі тагачаснаму грамадска - палітычнаму ладу дзяржавы. На сённяшні дзень відавочна неабходнасць іх пераасмыслення ў адпаведнасці са становішчам развіцця сучаснай адукацыі і педагагічнай думкі.

Раскрываючы матэрыял па тэме даследвання "Развіццё адукацыі на Беларусі ў перыяд з першай чвэрці XIX па першую чвэрць XX стагоддзя" (Полацкі край), мы прыйшлі да высновы, што праблема развіцця сістэмы адукацыі на Беларусі вывучана не ў поўным аб'ёме і існуе яшчэ шмат не раскрытых старонак у гісторыі развіцця адукацыі на Беларусі ў адзначаны перыяд. Усё вышэй сказанае актуалізуе выбар тэмы даследвання "Развіццё адукацыі на Беларусі ў перыяд з першай чвэрці XIX па першую чвэрць XX стагоддзя" (Полацкі край).

Распрацоўка новай адукацыйнай парадыгмы патрабуе звароту да гістарычнага мінулага, дзе можна знайсці ідэі, якія адпавядаюць сучаснасці, а таксама стымул далейшай распрацоўкі стратэгіі і тактыкі развіцця адукацыйнай мадэлі ў РБ. Навуковае грамадства разумее важкасць правядзення фундаментальных гісторыка-педагагічных даследванняў у галіне развіцця адукацыі. Ёсць шэраг гісторыка-педагагічных даследванняў, якія прысвечаны гісторыі развіцця адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды (гл. работы П.С.Івашчанка,

Е.Л.Еўдакімавай, Г.А.Качан, В.Н.Лухверчык, Н.Е.Новік, Г.П.Арловай, З.А.Пастуховай, А.А.Павільч, С.В.Сяліцкага, С.В.Снапкоўскай, Т.Г.Шаронавай и др.). Разам з тым, у работах вышэйназваных аўтараў закраноўваюцца толькі асобныя аспекты даследуемай праблемы, і не было ні воднага спецыяльнага гісторыка-педагагічнага даследвання, які раскрываў бы развіццё адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд з XIX стагоддзя па першую чвэрць XX стагоддзя ў Рэгіянальным аспекце. Усё вышэйсказанае актуалізуе выбар тэмы даследвання "Развіццё адукацыі на Беларусі ў перыяд з першай чвэрці XIX па першую чвэрць XX стагоддзя" (Полацкі край).

Аб'ект даследвання – адукацыя на Беларусі ў перыяд XIX - першай чвэрці XX стст

Прадмет даследвання – тэндэнцыі развіцця адукацыі ў Беларусі (Полацкі край) ў перыяд XIX - першай чвэрці XX стст.

Мэта даследвання – выявіць і ахарактарызаваць асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці развіцця сістэмы адукацыі на Беларусі ў XIX і першай чвэрці XX стст.

Задачы:

1. Паказаць асаблівасці развіцця адукацыі на Беларусі ў XIX ст.
2. Вызначыць накірункі развіцця адукацыі на Полатчыне ў першай пал. XIX ст.
3. Раскрыць этапы развіцця Полацкай езуіцкай акадэміі (1812-1820 гг).
4. Акрэсліць асноўныя тэндэнцыі развіцця адукацыі на Беларусі першай чвэрці XX ст.

Метадалагічныя асновы і метады даследвання. Педагогіка грунтуецца на двух стрыжнёвых прынцыпах, адлюстроўваючых прыродную і грамадскую сутнасць чалавека, прынцыпах прыродасавобразнасці і культурасавобразнасці. Прынцып культурасаабразнасці імпліцыдна прысутнічае ў большасці педагагічных канцэпцый. У першай палове XIX ст. у шэрагу канцэпцый: тэорыі грамадскачалавечай адукацыі Н.І. Пірагова, у выглядзе прынцыпа народнасці выхавання К.Д. Ушынскага і г.д.; у пачатку XXст. – у педагогіке як прыкладной філасофіі С.І. Гесэна і г.д. Пры разнастайнасці пазіцый аўтараў гэтых канцэпцый іх аб'ядноўвае агульны метадалагічны падыход – даследванне фенамену адукацыі ва ўзаемадзейнасці з грамадствам і культурай, арыентацыя адукацыі на характар культуры, яе каштоўнасці, дэтэрмініраванасць адукацыі сацыякультурным асяроддзем і разглядзе сферы адукацыі як фактара стабілізацыі і развіцця гэтага асяроддзя. Такім чынам, гэта адзін з найбольш перспектыўных накірункаў гісторыка - метадалагічнага аналіза развіцця айчыннай адукацыі.

Метадалагічную аснову даследвання складае междысцыплінарны сістэмны падыход, комплекс філасоўска - культуралагічных ідэй – аб абумоўленнасці педагагічных з'яў сацыяльнага і культурнага асяроддзя; аб уключэнні фенамена адукацыі ў гісторыка - культурны рух і аб яго ўплыве на гэты працэс; аб дынаміке культуры і змене культурных парадыгм; аб каштоўнасці, як стрыжні культуры і

арыентырах адукацыйнага працэса і яго вузлавых звенняў. У згоднасці з міждысцыплінарным сістэмным падыходам метады даследвання спалучаюць спосабы, прыёмы, прынцыпы, распрацаваныя ў разнастайных навуках, у тым ліку гісторыка - параўнаўчы метад, метады ретраспектыўнага аналізу, тыпалагізацыі, аналіза і сінтэза, гістарычнага і лагічнага, індукцыі і дэдукцыі, аспектны падыход, прынцыпы цэласнасці, дапаўняльнасці.

Крыніцы для правядзення дадзенага даследвання можна падзяліць на некалькі груп. Першую складаюць працы гісторыкаў, да якіх адносяцца Сапуноў А.П. “Заметки о коллегии и академии иезуитов в Полоцке” , Л.М. Велікoвіч “Черная гвардия Ватикана” , Т.Б. Бліновай “Езуіты ў Беларусі” , Кісялёў Р. Я. "Школа савецкай Беларусі", Каралёў Ф.Ф. "Нарысы па гісторыі савецкай школы і педагогікі (1917-1920гг.)", Каменская Н. В. "Станаўленне народнай адукацыі ў Беларусіі (1917-1920гг.), Ціток З. М. "Школа Беларусі ў перыяд грамадзянскай вайны і аднаўлення народнай гаспадаркі (1917-1925 гг.), Сцяпура З. "Усеагульнае навучанне ў БССР", да гэтай жа групы можна аднесці "Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі", працу Ільюшына І. М. і Умрэйка С. А. "Народная адукацыя ў БССР", калектыўную працу "Народная адукацыя і педагагічная думка ў Беларусі" і г. д. Цікавымі крыніцамі, якія ўтрымліваюць багаты дакументальны матэрыял, з'яўляюцца зборнік дакументаў "Народная адукацыя ў БССР" і зборнік "Савецкая Беларусія". Наступная група дакументаў – гэта перыядычныя выданні, да якіх адносяцца "Настаўніцкая газета", "Школа и культура советской Белоруссии", "Звязда".

Прац сучасных гісторыкаў па дадзенай тэме не шмат, цікавасць уяўляюць працы Еўдакімавай Е. Л. «Гимназическое образование в Белоруссии: историческнй опыт н тенденцнн развития (19 – начало 20 вв.)», Флитга Н. В. "Школа в России в конце 19-начале 20 веков". Акрамя таго, шэраг інфармацыі ўтрымліваецца ў агульных працах па гісторыі Беларусі: "Гісторыя Беларусі (пад рэд. Каханоўскага А. Г.), "Гісторыя Беларусі" (пад рэд. Новіка Е. К. і Марцуля Г. С.), "Гісторыя культуры Беларусі" Лыча Л. і Навіцкага У., у энцыклапедыі "Гісторыя Беларусі". Асобнай групай крыніц з'яўляюцца дакументы Народнага Камісарыята асветы, якія знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Менавіта яны дазваляюць стварыць найбольш аб'ектыўную карціну развіцця сістэмы народнай адукацыі ў БССР. Але нягледзячы на такі разнастайны комплекс крыніц, змястоўных манаграфій па гэтай тэме няма.

Навуковая наваізна даследвання: паказваны асаблівасці развіцця адукацыі на Беларусі (пераемнаць адукацыі; яе рэлігійны характар; пераход да свецкай адукацыі ў другой палове XIX стагоддзя; жорсткі нагляд за школай расійскага ўрада; самафінансаванне беларускіх школ; абмежаванне доступаў у сярэднюю школу выхадцаў з ніжэйшых саслоўяў; цесная сувязь эканамічнага развіцця з павелічэннем колькасці школ і іншых навучальных устаноў); - абазначаны

асноўныя тэндэнцыі развіцця адукацыі ў перыяд з першай чвэрці XIX па першую чвэрць XX стагоддзя; - раскрыты асноўныя этапы развіцця Полацкай езуіцкай акадэміі; ў навуковы зварот уведзены новыя, раней не выкарыстаныя архіўныя матэрыялы НА РБ.

Практычная значнасць даследвання. Матэрыялы даследвання могуць быць выкарыстаны ў якасці лекцый па педагогіке, гісторыі і культуралогіі, для правядзення семінараў, спецкурсаў, для падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, вынасімыя на абарону:

1. У згоднасці са спецыфікай сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў жыцця ў развіцці адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў XIX стагоддзі можна вылучыць наступныя асаблівасці: - манаполія царквы на адукацыю (удзел розных рэлігіёзных канфесій ў развіцці сістэмы адукацыі, амаль саслоўна-замкнуты характар школьнай сістэмы); - паслядоўная змена прагрэсіўных рэформ і контрарэформ у адукацыі. Так, з 60-х гадоў усталёўваецца народная школа, ўсе тыпы навучальных устаноў становяцца безсаслоўнымі, агульнадаступнымі, адкрываюцца школы для дзяўчынак; пасля 1863 года ўзмацняецца русіфікацыя, ўзрастае роля царквы ў адукацыі; - саслоўна-класавая палітыка русіфікацыі прывяла да рэалізацыі прынцыпа "Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць", які стаў прыярытэтным у развіцці адукацыі амаль да 1917 года (дамінаванне рускай мовы і адмаўленне ад беларускай мовы, манаполія царквы ў адукацыі з акцэнтам на рускую праваслаўную царкву, развіццё пачатковай школы пры стрыманні развіцця сярэдняй і вышэйшай адукацыі); - грамадскі рух за стварэнне народнай школы на беларускай мове.

2. Гісторыка-педагагічны аналіз дазваляе вылучыць асноўныя накірункі развіцця адукацыі ў Полацкім краі ў першай палове XIX стагодддзя: абмежаванасць і маладаступнасць адукацыі; пераемнасць; развіццё жаночай адукацыі; павелічэнне колькасці агульнаадукацыйных школ; сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў; русіфікацыя школы і школьнай справы; саслоўна - класавая русіфікацыйная палітыка; рэалізацыя прынцыпу "саслоўе, праваслаўе і народнасць"; дамінаванне рускай мовы і адмова ад беларускай.

3. Развіццё Полацкай езуіцкай акадэміі праходзіла ў некалькі этапаў : - станаўленне (1812- 1813гг.) (падбор педагагічных кадраў, першасная распрацоўка і апрабацыя вучэбна-метадычнага забеспячэння педагагічнага працэса і арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы акадэміі); - устойлівае прагрэсіўнае развіццё (прафесійная падрыхтоўка прафесарска-выкладчыцкага састава, шырокая навукова-практычная дзейнасць акадэміі, якасна новы ўзровень арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэса. Асаблівасць у развіцці Полацкай езуіцкай акадэміі – яе росквіт у перыяд закрыцця. Полацкай езуіцкай акадэміі належыць выключная роля і месца ў развіцці сусветнага гісторыка-педагагічнага працэса (уплыў вопыта і асветніцкіх ідэй на развіццё адукацыі ў буйнейшых краінах свету).

4. У развіцці сістэмы адукацыі Беларусі першай чвэрці XX стагоддзя можна вылучыць шэраг тэндэнцый. З пачатку стагоддзя і амаль да 1917 года: працягвае рэалізоўвацца вядучы прынцып дзяржаўнай палітыкі – самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць; узмацняецца грамадскі рух за дэмакратызацыю і аднаўленне школы, барацьба за стварэнне беларускай нацыянальнай школы, манаполія царквы на адукацыю з увядзеннем земства (1911 г.) узмацняе свецкі характар адукацыі. Пачынаючы з 1917 года рэалізуецца новая ідэалогія ў развіцці адукацыі, накіраваная на стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Гэтаму садзейнічае ўвядзенне навучання на роднай мове, беларусізацыя, якая забяспечыла ўвядзенне ў адукацыйны працэс курс "Беларусазнаўства", шырокае разгортванне краязнаўчай работы ў стране. Ажыццяўлялась пераемнасць у адукацыі (стварэнне адзінай школы з пераемнымі ступенямі). Фарміруюцца вядучыя прынцыпы арганізацыі прагрэсіўнай адукацыйнай сістэмы: дэмакратызацыя, рэалізацыя права ўсіх грамадзян на адукацыю незалежна ад расавай, нацыянальнай прыналежнасці і сацыяльнага палажэння, роўнасць у адукацыі жанчын і мужчын, навучанне на роднай мове, свецкасць адукацыі.

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства ў сувязі з пераходам да 12-гадовай сістэмы адукацыі заканадаўча замацаваны наступныя прынцыпы адукацыі: - павышэнне прыярытэту адукацыі ў дзяржаве і грамадстве; - пераход з 90-х гадоў XX стагоддзя школы ў асноўным на беларускую мову навучання; - даступнасць адукацыі для кожнага грамадзяніна; - гуманізацыя і дэмакратызацыя адукацыі; - непрырыўнасць адукацыі і пераемнасць яе ступеняў.

Апрабацыя вынікаў даследвання. Матэрыялы даследвання прадстаўлены на навуковай канферэнцыі „Актуальные проблемы теории и истории педагогики„ прысвечанай памяці С. Сяліцкага; рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Роль молодежных организаций и объединений в гражданском становлении личности", а таксама на днях навукі каледжа; вынікі даследвання выкарыстоўвалася ў якасці дапаможнага матэрыяла на практычных занятках па педагогіке і гісторыі.

Структура дысертацыі. Дысертацыя складаецца з уводзін, 2 глаў, заключэння, спіса літаратуры, які складае 85 крыніц.